№№131–132
(3468–3469)

30 жніўня 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

**Да ўвагі!**
*Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!*

www.nv-online.info

# Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*

***Якуб КОЛАС***

## Знікае школа, потым — вёска

У гэтым навучальным годзе 70 школ не адчыняць дзверы. Прычым зачыняюцца не толькі пачатковыя і базавыя, але і сярэднія навучальныя ўстановы.

Акрамя таго, скарачаецца і агульная колькасць школьнікаў. У мінулым навучальным годзе іх было больш за 940 тысяч, а ў гэтым годзе — амаль на 22 тысячы менш.

# Аляксандр Лукашэнка прапануе прадстаўнікам усіх палітычных лагераў сесці за «круглы стол»

У панядзелак Аляксандр Лукашэнка прапанаваў прадстаўнікам усіх палітычных лагераў сесці за "круглы стол" для выпрацоўкі заходаў па паляпшэнні сітуацыі ў краіне.

*"Я как глава государства предлагаю всем здравомыслящим и любящим свою страну людям, к какому бы политическому лагерю они ни принадлежали, сесть за "круглый стол", посмотреть друг другу в глаза и реально оценить, кто чего стоит и что может сделать для эффективного улучшения ситуации в стране"*, — заявіў Аляксандр Лукашэнка ў панядзелак у Мінску на нарадзе педагагічнага актыву Беларусі.

Акрамя таго, ён заявіў: *"Европейскому Союзу, другим европейским и международным структурам, хотел бы предложить и России, направить своих представителей для участия в этом "круглом столе". "Пусть они заодно посмотрят, кто у нас чего стоит, какие идеи выдвигает, какие цели перед собой ставит. Мы абсолютно открыты и готовы дать им такую возможность"*, — сказаў ён.

*"Давайте разговаривать, и мы придем к взаимопониманию"*, — дадаў ён.

**АКТУАЛИИ**



***Светлана КАЛИНКИНА***

# Нет страны несчастнее

Беларусь объявили самой несчастной страной мира. В этом грустном рейтинге мы заняли самое позорное место. Дожили, называется. Допелись, доплясались, в хоккей наигрались.

Как следует из пояснения составителей, камнем, потянувшим Беларусь на самое дно, стала рекордная инфляция, обесценение национальных денег, внезапное обнищание людей. Но все-таки это поверхностное и не совсем научное объяснение. Поскольку давно замечен удивительный парадокс: самые счастливые люди живут именно в бедных странах и очень часто — в диктатурах.

Северокорейцы, например, все поголовно счастливы, что ими правит "великий и любимый руководитель" Ким Чен Ир. Есть нечего, мясо — по праздникам, а они радостно выходят на парады и рыдают от счастья после каждого слова своего "великого полководца".

А может, советские люди утомились от счастья, которое им дал "гений" по фамилии Джугашвили?.. Так ведь нет! Когда он умер, рыдали даже в лагерях. И до сих пор находятся те, кто превозносит Сталина, хотя осиновый кол на могиле — единственный достойный памятник таким деятелям.

Специалисты говорят, что "индекс несчастья" зависит не от бедности. Социологи установили другую связь: чем больше неравенства в стране — тем более несчастны ее жители. И белорусов, судя по всему, напрягает не бедность: мы ведь и не жили никогда богато. Людей напрягает именно эта несправедливость: когда один получает Героя Беларуси и дом в Дроздах за то, что обобрал людей инфляциями-девальвациями, а другой бьется с утра до вечера на двух работах, но даже лишние ботинки не может себе купить. Уже невозможно не видеть, что Минск стал городом контрастов, где количество купленных дорогих машин бьет европейские рекорды, где средней руки чиновник может выстроить себе не дом, а дворец. Но при этом средняя зарплата по стране — меньше 200 долларов, и большое количество людей вынуждено экономить на еде, потому что больше экономить не на чем.

А еще "индекс несчастья" — это, как правило, свидетельство атмосферы безнадеги. О каком счастье можно говорить, когда человек понимает, что от него ничего не зависит, что перспектив никаких, что, как ты ни старайся, что ни делай, — все впустую. И плюс к этому тот, кто тебя обобрал, кто живет за твой счет, еще будет издевательски объяснять: "Плохо работаешь!"

Жаловаться — некому. Правду искать — бессмысленно. Откроешь рот — уволят. Выйдешь протестовать — тюрьма. Но как только выборы — тебе командуют: "Улыбайся! Радуйся! Поддерживай! Приветствуй!"

Это и есть безнадега. Мучительная, тягостная, вязкая, засасывающая.

Лично я поставила бы Беларусь в лидеры по рейтингу невезения. Когда подумаешь, на что ушли последние 17 лет нашей истории, хочется подвесить Вячеслава Францевича Кебича за одно место. Власти ему, видите ли, мало было, президентом стать хотел... Именно он затеял возню с введением в Беларуси президентского поста, а команда (Коротченя, Мясникович, Кравченко, Заметалин и т.п.) спешили выслужиться. Вот и получили.

А ведь у Беларуси было все, чтобы стать нормальной европейской страной. Польша, Чехия, Литва не имели тех стартовых возможностей, что были у Беларуси. Но они уже давно зажили нормальной жизнью, стали на равных с развитыми европейскими странами, и никого не боятся. А мы, как выжившие из ума партизаны, не хотели понимать, что война закончилась. Мы придумали себе кольцо врагов, уже не по одному разу переругались с соседями, и не живем, а выживаем. Мужественно боремся с проблемами, которые сами же себе и устраиваем...

Вот уж не свезло так не свезло!

17 лет назад, выбрав президентом Александра Лукашенко, белорусы приняли роковое решение. И теперь имеем результат: как выяснилось, нет в мире страны несчастнее. Молодежь ищет любую возможность, чтобы уехать; пенсионеры боятся даже думать о том, что будет завтра, когда дачные запасы окажутся съедены, а в жировках появится плата за отопление. Покидают страну журналисты, музыканты, политики, врачи, программисты, строители — все, у кого есть хоть какая-то востребованная специальность.

История, конечно, не знает сослагательного наклонения: как было бы, если бы... Но как обидно понимать, что все могло быть по-другому, если бы в 1994-м мы сделали другой выбор! Что Беларусь могла праздновать 20-летие независимости цивилизованной, уважаемой, богатой, спокойной страной. Страной, которая идет вперед, а не назад. Но...

Безнадега... Отчаяние... Разочарование... Усталость... К сожалению, это про наше общество. Это про нас. И 20-летие независимости официальные власти вообще не праздновали. Они просто не понимают этот праздник.

**СТОП-КАДР**




## Чарга ў ...15 кіламетраў

*У мінулую нядзелю чарга з грузавых машын на памежным пераходзе "Каменны Лог" з беларускага боку дасягала 15 кіламетраў!*

Па звестках Дзяржаўнага памежнага камітэта Беларусі, 28 жніўня днём чарга з грузавых машын складала 400 адзінак, легкавых — 110. Вечарам усё заставалася па-ранейшаму, а чарга з грузавікоў нават павялічылася.

Натуральна, што выхадныя заўсёды застаюцца "гарачымі днямі", але і ўчора сітуацыя працягвала заставацца не ідэальнай.

Сайт Дзяржаўнага памежнага камітэта даваў наступную інфармацыю па сітуацыі на беларуска-літоўскай мяжы па стане на 17.00 29 жніўня:

**пункт пропуску "Каменны Лог":** уезд у Беларусь — 15 грузавых, 40 легкавых; выезд з Беларусі — 440 грузавых, 30 легкавых;

Як бачым, праблема з пропускам грузавых машын у пункце "Каменны Лог" застаецца.

**Алесь СВЯТЛАНІЧ.**

**БЛІЦ**

*На 8 кастрычніка беларуская апазіцыя рыхтуе правядзенне ў Беларусі* ***Народных сходаў.*** *Па задумцы ініцыятараў мерапрыемства, Народныя сходы — гэта масавыя сходы грамадзян, на якіх яны абмяркуюць набалелыя праблемы і прымуць рашэнні, як супольнымі намаганнямі з імі справіцца.*

*Учора "Народная Воля" вырашыла звярнуцца да шэрагу звычайных людзей з адным пытаннем:*

# «Ці ведаеце вы, што адбудзецца ў Беларусі 8 кастрычніка?»

**Юрый Бычкоў, інжынер-будаўнік:**

— Не, не ведаю...

**Аляксей МАРХВІДА, адміністратар камп'ютарных сетак:**

— Канечне ж, ведаю! У гэты дзень на "Мінск-Арэне" хакейны клуб "Дынама" будзе гуляць у Кантынентальнай хакейнай лізе супраць новакузнецкага "Металлурга".

**Юрый АЛЯКСАНДРЫН, інжынер па аўтаматычным кіраванні:**

— Не, не ведаю...

**Марына КАРАМАН, фінансіст:**

— Не ведаю, даражэнькія мае. І ведаць не хачу...

**Ніна ЦЯРЭШЧАНКА, гандлярка рынку гандлёва-забаўляльнага цэнтра "Экспабел":**

— Не ведаю.

**Уладзіслаў ПІСАРЫК, адміністратар фірмы "Матэна":**

— Нічога не чуў, ні пра якое мерапрыемства ў гэты дзень не ведаю.

**Наталля АДАРЧАНКА, маладая маці ў дэкрэтным адпачынку:**

— На календары будзе субота, а што яшчэ... не ведаю...

**Андрэй КІЗЕВІЧ, супрацоўнік аўтазапраўкі:**

— Свята нейкае? Не, тады не ведаю...

**Юлія АБРАГІМОВІЧ, выкладчыца нямецкай мовы:**

— Не, а што будзе? Народны сход? Я пра гэта нічога не ведаю...

**Канстанцін ШЛОМА, праграміст:**

— Не, не ведаю я, што ў гэты дзень будзе...

**Юрый РАХЦЯЕНКА, дызайнер:**

— Ну, я так разумею, народны сход плануецца. Адкуль ведаю? Прачытаў пра гэта ў інтэрнэце.

**Вольга БУЛГАКАВА, хімік-тэхнолаг:**

— Так, ведаю, плануецца правядзенне Народнага сходу. Я пра гэта нядаўна чытала. Ці буду ўдзельнічаць? Наўрад ці. Не веру, што мой удзел нешта дасць, а тым больш зменіць...

**Дзіяна ПАЎЛАВЕЦ, пенсіянерка:**

— Не, не ведаю

**Дзяніс ХАЖАВЕЦ, выпускнік БДУ:**

— Не ведаю.

**Аляксандр ЛАБАСЮК, кладаўшчык:**

— Не, не ведаю. А што будзе? Народны сход? Па гэта мне нічога не вядома.

**Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.**

## АД РЭДАКЦЫІ

*Вось вам і адказ на пытанне, чаму ў Беларусі няма ніякіх перамен.*

*Любая ініцыятыва можа застацца пустым гукам, калі яна загадзя не будзе даведзена да шырокай грамадскасці, калі з масамі не папрацуюць актывісты. Да 8 кастрычніка, лічы, некалькі тыдняў, а мала хто ведае, што на гэты дзень запланаваны Народныя сходы. Арганізатарам не толькі ёсць над чым задумацца, але ім трэба яшчэ нямала і папрацаваць. Не спаць у шапку, а днём і ноччу круціцца, каб задуманая акцыя не праваліласяі. Каб у зладнікаў не з'явілася нагоды ў чарговы раз пакпіць: якая апазіцыя — такая і акцыя.*

**ОФИЦИАЛЬНО**

# *Александр ЛУКАШЕНКО: «Назрела необходимость встряхнуть педагогическую общественность страны»*

*Судя по всему, реформирование средней школы Беларуси не закончилось.*

*Вчера на Республиканском совещании педагогического актива А.Лукашенко заявил, что "назрела необходимость встряхнуть педагогическую общественность страны".*

— Учитель приходит в школу, как на завод, фабрику: отработал время и ушел домой, — заявил на совещании Лукашенко. — Так школа развиваться не может. (...) Налицо уже не в отдельных, а во многих случаях массовое нарушение элементарного порядка, отсутствие контроля, видимой перспективы.

Лукашенко признался, что обеспокоен тем, кто побеждает в борьбе за влияние на умы и души детей: "родители, учителя или сомнительные "друзья" и политические проходимцы, вовлекающие молодежь во всевозможные авантюры". Хотя тут же отметил, что "без нашего учительства не было бы нормальной политики в нашем государстве. Вы действительно основа политики нашего государства. Все политические кампании, все направления деятельности в стране так или иначе опираются на вас".

## Денег не будет

Ответ на главный вопрос — как государство намерено привлекать в школу профессионалов, решать кадровый вопрос, — судя по всему так и остался открытым. Во всяком случае, комментируя выступление одной из участниц совещания, которая говорила о том, что учителей надо материально стимулировать, повышать зарплаты и пособия, Александр Лукашенко заявил: "А деньги где? Мы столько выдали в свое время денег на руки обществу, что сегодня пожинаем плоды такой политики. Экономические законы действуют объективно, хотим мы этого или не хотим. Для того, чтобы все это обеспечить, нужны деньги. Поэтому будут деньги — будем двигаться в этом направлении, денег не будет — печатать мы их не будем, их надо заработать".

Но, возможно, к 1 сентября учителя получат пособие 400—600 тысяч в зависимости от возможности бюджета. Правда, учителя и сами могут продвигаться к высокой зарплате, заметил Александр Лукашенко. Но не уточнил, как именно работники бюджетной сферы могут повысить свой материальный достаток.

## К слову

Каждый август накануне нового учебного года педагоги собираются на педагогические конференции. Как правило, это форумы областного уровня. Но в этом году было решено провести Республиканское совещание педагогического актива с участием Лукашенко.

На форум были приглашены 2,6 тыс. учителей, воспитателей, руководителей учреждений образования всех регионов Беларуси. Накануне мероприятия для педагогов-участников совещания было организовано торжественное мероприятие, которое состоялось в Концертном зале "Минск".

**Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.**

***Дарагі, любы наш тата і дзядуля Павел Васільевіч Іваненка!***

***Віншуем цябе з 85-годдзем і жадаем жыць з намі яшчэ доўгія гады!***

*Ты сваім прыкладам вучыў і вучыш нас жыць цвяроза і вольна, мужнымі і годнымі, добра вучыцца, плённа працаваць, сваю Радзіму Беларусь шанаваць.*

*Дзякуй за ўсё, што ты для нас зрабіў!*



***Твае дзеці, унукі і праўнукі — тры сям'і.***

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

*Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук*



# Совещание-обещание — и всё?

Бизнес-сообщество, да и экономически активное население наконец-то дождались широко анонсированного совещания властей по актуальным вопросам социально-экономического развития страны, которое состоялось в Администрации президента 25 августа. От него все ожидали четких и конкретных решений, которые оздоровили бы финансово-экономическую ситуацию, складывающуюся в Беларуси на протяжении шести последних месяцев, вывели бы из крутого пике падающий белорусский рубль.

Ничего из этого не вышло. То ли совещание было плохо подготовлено, то ли власти совсем дезориентированы и не видят решительного выхода из валютного тупика. Понятно, что именно валютные вопросы стояли в центре внимания совещавшихся. Однако на этот счет было услышано очередное президентское обещание насчет того, что дается полтора-два месяца... на стабилизацию на валютном рынке. Многое из того, что было сказано и заявлено на этом совещании, можно расценить как непроизвольный антипиар действий белорусских властей. Почему же беднеет народ, а большая часть частного бизнеса поставлена на грань выживания, когда ВВП страны вырос за 7 месяцев на 10% ("это самый высокий рост в мире"), а в первом полугодии поступление валютной выручки достигло своего "исторического максимума и составило свыше 20 млрд долларов"? Почему тогда всю страну трясет от инфляции, дефицита валюты и товаров? И зачем было заявлять, что "никакого замораживания вкладов населения нам нет необходимости делать"? Это лишь пикировки ушлых экономистов в интернете, а теперь многие валютные вкладчики задумаются: не перейти ли на "матрацные" сбережения? Итак, с марта по июнь физические лица изъяли из банков более 1,3 млрд в долларовом эквиваленте — почти четвертую часть своих сбережений. Только в июле процесс приостановился.

На совещании многое можно было решить, принять действительно волевые решения. По сокращению кредитной эмиссии, ограничению галопирующей инфляции, по переходу на единый курс рубля, по комплексной программе преодоления усиливающегося валютно-финансового кризиса. Наконец, хотя бы решение о проведении назревшей девальвации официального курса белорусского рубля. Вместо этого очередную тарелку в посудной лавке бьет Нацбанк. Он рекомендует коммерческим банкам перевести расположенные на территории крупных торговых центров и рынков пункты обмена валют только в режим покупки валюты. Под предлогом благих намерений. С тем чтобы продавать эту валюту на социальные цели, чем уже занимается ряд банков. Кроме того, есть необходимость упорядочить ситуацию вокруг обменных пунктов. Иначе говоря, убрать огромные списочные очереди, "схваченные" валютчиками. Да и картинка открытия торговых центров, когда люди с низкого старта бросаются, расталкивая друг друга, к обменникам, напоминает раздачу продовольствия представителями ООН в голодных африканских странах.

Результат благих намерений все тот же. Сужение возможностей для населения легально приобрести валюту привело к тому, что доллар на черном и сером рынках в очередном прыжке приблизился к символической планке в 10.000 рублей. На сером (межбанковском) рынке доллар котируется по курсу 9700—9900, евро — по 14.050—14.420, российский рубль — 310—336 рублей. Таким образом, грубо говоря, девальвация реального курса рубля достигла 100% (10.000:5000). Стремление Нацбанка заполучить в свою копилку побольше валюты в общем-то понятно. И даже валюты весьма разнообразной. Он расширил своим постановлением перечень иностранных валют, 30% экспортной выручки которых подлежат обязательной продаже. Это венгерский форинт, израильский шекель, польский злотый, турецкая лира, чешская крона, литовский лит, латвийский лат, казахский тенге, китайский юань. По сути, перечень пополнили валюты всех наших основных торговых партнеров, за исключением Украины и Молдовы. Думается, и их очередь не за горами.

Похоже, что в своей валютной экспроприации главный регулятор намерен идти дальше. Он усиленно рекомендует коммерческим банкам, которым должен валюты больше, чем у него в резервах, и предприятиям покупать свои валютные облигации. Как сообщают в интернете, Нацбанк заставляет белорусские банки продавать валютные депозиты населения. На рассмотрении правительства находится проект постановления о запрете белорусским экспортерам заключать бартерные сделки с нерезидентами. Товарообменные операции, а также взаимозачеты с зарубежными партнерами сегодня дают возможность бизнесу хоть как-то выживать в отсутствие возможности приобрести валюту. Многие предприятия малого и среднего бизнеса отпускают сотрудников в вынужденные отпуска, сокращают персонал, несут огромные убытки. А главное, не знают, что ждет их в ближайшем будущем.

Получается, что власти не видят пока иных способов борьбы с валютным кризисом, кроме административных ограничений и ручного управления. Это вызывает у бизнеса дальнейшие девальвационные ожидания. Их подогревают разрешения населению покупки за валюту автомобилей, жилья, которые усиливают долларизацию экономики, отталкивают народ от белорусского рубля. Налицо желание властей любыми способами вырвать валюту у физических лиц, на руках у которых, по некоторым, на наш взгляд, завышенным оценкам, находится от 12 до 14 млрд долларов.

Специалисты госорганов оценивают прирост кредитной задолженности экономики в текущем году на уровне прошлого года — 40%. Но с начала года инфляция достигла уже 45,8%. По их же данным льготное финансирование госпрограмм Беларуси сократилось на 10 трлн рублей. В июле зафиксировано положительное сальдо внешней торговли в 250 млн долларов. Благодаря ограничениям на покупку валюты за май-июнь банки на чистой основе купили у населения 130 млн долларов, в июле — 48,8 миллиона. При этом на социальные нужды за май-июнь продано населению только 2,5 млн. долларов. Правдами и неправдами административные меры дают некоторые положительные результаты, связанные в первую очередь с увеличением золотовалютных резервов. Напомним, что из 4,2 млрд долларов резервов валютная составляющая — всего 1,5 миллиарда. В то же время госорганами отмечено замедление темпов роста экономики, инвестиционных процессов. В сложившейся обстановке иностранные инвесторы не желают входить на белорусский рынок. Им совершенно не ясно, как наши предприятия будут возвращать вкладываемые в них валютные средства.

В ближайшие дни президент обязал правительство представить конкретные решения по стабилизации валютного и потребительского рынков. Наверняка, пока придут долгожданные миллионы валюты от внешних кредиторов и продажи госсобственности, экономическая ситуация может стать вообще непредсказуемой. Никогда в истории суверенной Беларуси она так решительно и рабски не зависела от простого обменного курса национальной денежной единицы к какому-то заокеанскому "зеленому" — денежной единице так не любимого белорусским руководством чужого государства.

ОТКРОВЕННО

## *Надо было научиться управлять своей страной, а не лезть в какой-то союз...*

Хотелось бы пару слов сказать по поводу высказывания Вячеслава Францевича Кебича "Главная цель России — проглотить Беларусь без остатка". Если бы у него "не было рацыі", не стал бы он делать такое заявление. Вот и у меня в связи с этим возникли раздумья. Почему после создания СНГ ни одна из бывших республик СССР не спешила так быстро создавать с Россией так называемое союзное государство, как это сделала Беларусь? И что в итоге? Может, мы стали жить лучше других? Судя по всему, мы живем хуже. А что, после создания Таможенного союза народ Беларуси разбогател? Нет, беднее становимся. До создания этого "союза" я зарабатывал 450 долларов, сейчас осталось 270.

По-моему, за все годы независимости надо было не заигрывать с Кремлем, а как следует научиться управлять своей собственной страной, экономикой, финансами. Научиться проводить свободные выборы — парламентские, президентские. Нужно было проводить свою национальную политику, как это делали бывшие союзные республики. Мы же при малейших трудностях старались прижаться к "старшему брату". А сегодня боимся своих белорусских рублей, боимся своих собственных законов и указов, мы уже стали бояться своего белорусского языка и культуры. Честно говоря, даже не знаю, проглотит нас Россия или поперхнется. Скажу только одно: нам, простым работягам, со своими правителями хоть плачь.

**С уважением —**

**В.М.ПОТЕМКИН, рабочий.**

**Могилев.**

ДЫСКУСІЯ

# Кебіч хоча пакаяцца?

Калі прачытаў у "Народнай Волі" выказванне экс-прем'ера Беларусі Вячаслава Кебіча "Главная цель России — проглотить Беларусь без остатка", вельмі здзівіўся ён упершыню дазволіў сабе падобнае выказванне. Няўжо ў сталым узросце ў яго прасвятлелі мазгі? Ці яго проста апанаваў страх за сваё мінулае, і зараз, так бы мовіць, ён пачынае лашчыцца, як шкадлівы кот, бо адчувае сваім сэрцам, што рэжым хутка лясне? Вось і хоча рэбілітавацца. Гэта тыповыя паводзіны "артадоксаў". Пакуль сядзеў у падагрэтым крэсле (так у народзе называюць Авальную залу), дык маўчаў і драмаў.

Што і казаць, Вячаславу Кебічу ёсць чаго баяцца. Менавіта ён не толькі першым загаварыў аб увядзенні расійскага рубля ў Беларусі, але практычна і намагаўся гэта зрабіць. Магчыма, чытачы памятаюць, як спадар Кебіч паляцеў у Маскву і стаў дамаўляцца з Ельцыным аб увядзенні ў Беларусі расійскага рубля. Фактычна гэта быў дазвол для Расіі на анексію Беларусі.

У адпаведнасці з беларускім заканадаўствам гэты крок сп.Кебіча кваліфікаваўся як дзяржаўная здрада. Таму, я лічу, па вяртанні ў Мінск сп.Кебіч павінен быў быць тэрмінова арыштаваны. Але чамусьці старшыня Вярхоўнага Савета 12-га склікання сп.Грыб не звярнуўся ў пракуратуру з такой просьбай, што і па сённяшні дзень для беларускага народа застаецца загадкай.

Наступнае дзяржаўнае цынічнае злачынства — скасаванне дзяржаўнай мяжы з Расіяй. Менавіта з гэтага моманту і пачалося пачварнае паглынанне Беларусі Расіяй.

На сённяшні дзень па ўсіх міжнародных паперах Беларусь быццам бы існуе як самастойная краіна, а па факце такой краіны ўжо, можна сказаць, няма. Як можна назваць краіну незалежнай, суверэннай, калі ў ёй амаль не чуваць мовы тытульнай нацыі, скасавана дзяржаўная мяжа і гэтак далей.

Калі наш народ не ўсвядоміць усяго трагізму, які яму нясе сённяшняя ўлада, дык ужо наступнае пакаленне не будзе ведаць наогул значэння слова *Беларусь.*

Любыя дыктатарскія рэжымы самі па сабе не маюць моцы, яны трымаюцца ў асноўным на прыслужніках. Калі ў апошніх прачынаецца нейкі сорам і яны пачынаюць усведамляць, на чыю мельніцу яны льюць ваду, — рэжым імгнення падае, гэта гістарычная аксіёма. Можа, сапраўды спадар Кебіч хоча пакаяцца перад беларускім народам?..

**Мікола КАНАХОВІЧ, ветэран Узброеных сіл.**

*г.Пружаны.*

ГЛАС НАРОДА

# Депутаты должны быть не от власти...

*Скоро грядут очередные выборы в белорусский парламент. Но у меня как у простого гражданина нашей страны возникает вопрос: идти ли на такие выборы? Стоит ли голосовать за кандидатов, предложенных не народом, а самой властью?*

По моей д.Гдень я помню трех депутатов — Снегиря, Кулика и Дашкевича. Когда-то я был на приеме в Минске у Снегиря — в прокуратуре (был он тогда кандидатом в депутаты). Хорошо поговорили о судьбе д.Гдень, страны Беларусь. Пообещал т.Снегирь принять участие в судьбоносных решениях. И все. До сих пор молчит. И где он теперь? Говорят, в тюрьме.

Второй "наш" депутат — В.В.Кулик. Приезжал часто в Брагин. Но ничего не решил конкретного как по д.Гдень, так и относительно трагической судьбы белорусов в связи с чернобыльской трагедией. Хотя на мое заявление Кулик ответил трафаретно: мы, мол, на сессиях постоянно рассматриваем вопросы по ликвидации последствий катастрофы. Как ловко чиновники научились отмахиваться от конкретных вопросов и предложений!

Кулик хоть ответ написал, а вот третий "наш" депутат, Георгий Викторович Дашкевич, так вообще, видимо, не уважает людей. Ну конечно, ведь пришел он в парламент из Гомельского облисполкома. В начале этого года я написал Дашкевичу письмо о необходимости вернуть льготы по ст.19, коснулся и других аспектов, связанных с катастрофой на Чернобыльской АЭС. Официального ответа до сих пор не получил. Несколько раз разговаривал с депутатом по телефону. Сначала разговор у нас был доброжелательный. Георгий Викторович приглашал приехать на встречу с ним в Брагин и обсудить поднятые вопросы. Он не подумал о том, что у меня нет времени для этого, у меня на обслуживании по соцуходу двое престарелых родителей. Да и при нынешнем экономическом положении даже в райцентр съездить проблематично. Что, депутату трудно приехать в нашу деревню и на месте выслушать людей?

Нет, депутаты должны быть не от власти, а от народа. Тогда и связь с ними будет более толковой.

**Анатолий ЛЕВЧЕНКО, житель д.Гдень Брагинского района.**

## *Няхай Расія лепш праглыне...*

Кранулі мяне словы былога кіраўніка ўрада Вячаслава Кебіча. Прааналізаваўшы іх, я прыйшоў да высновы: не, Беларусь немагчыма праглынуць. Але, на жаль, можна абрабаваць, кінуць змагароў за краты...

Няхай Расія лепш праглыне беларускі КДБ, перафарбаваны з часоў КПСС. Няхай праглыне "незалежнасць" беларускіх судоў, якія абвінавачваюць за плясканне ў ладкі нават аднарукага. Няхай праглыне падабенства ГУЛАГу, якое існуе з савецкай пары ў Беларусі. Няхай праглыне шмат іншага, непатрэбнага нашай краіне, якая гістарычна належыць да еўрапейскай сям'і. Вось за гэта беларусы будуць вельмі ўдзячны Расіі. Як зараз удзячны некаторым палітыкам Захаду за падтрымку ў нашым жаданні жыць у цывілізаванай краіне.

**З павагай —**

**Ігар МІХНАВЕЦ, г.Івацэвічы, ПК-5.**

# Как росли и снижались цены на квартиры в Минске




## *Колькі можна падкідваць?*



САЛІГОРСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
вул. Козлова, 35, 223710, г. Салігорск
Тэл./факс 22-02-83

СОЛИГОРСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
ул. Козлова, 35, 223710, г. Солигорск
Тел./факс 22-02-83

___ № ___

На № ______ от ______

Руководителю

Уважаемый (ая) ___!

Учитывая сложные погодные условия 2011 года в Солигорском районе (засуха в мае и начале июня) и в связи с удорожанием в разы потребляемых материальных ресурсов (в частности на ГСМ), а также регулированием государством закупочных цен на сельскохозяйственную продукцию, как социально-значимые товары, сложилось крайне тяжелое финансовое положение в сельскохозяйственных организациях района. Для заготовки кормов, уборки зерновых культур требуется 750 тонн дизельного топлива на сумму более 3,0 млрд. рублей.

В связи с этим, в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 1 июля 2005 года № 300 «О предоставлении и использовании безвозмездной (спонсорской) помощи», Солигорский районный исполнительный комитет обращается к Вам с просьбой о поэтапном перечислении в течение июня-июля-августа 2011 года финансовой помощи сельскому хозяйству района в сумме ______ млн. рублей для проведения уборочной кампании.

Указанную сумму просим перечислить на расчетный счет Управления сельского хозяйства и продовольствия Солигорского райисполкома №3604200320076, отделение ОАО «Белагропромбанк» г.Солигорск, код 917, УНП 600033243 (назначение платежа - «спонсорская помощь»).

Рассчитываем на взаимопонимание и поддержку в решении данного вопроса.

С уважением,

Председатель исполкома А.Б.Римашевский

### АД РЭДАКЦЫІ

Няцяжка здагадацца, чаму чалавек, які даслаў у рэдакцыю копію ліста старшыні Салігорскага раённага выканаўчага камітэта А.Рымашэўскага, вымараў прозвішча кіраўніка арганізацыі, якому ён адрасаваўся, а таксама нумарныя рэквізіты.

Але факт застаецца фактам: калгасна-саўгасная (змена шыльды нічога не прынесла) сельская гаспадарка як тая дойная карова: падкінеш корму — будзе малако, не падкінеш — застаецца толькі аблізвацца.

Скажыце: колькі можна падкідваць? Закончыцца ўборка — наступіць перавод жывёлы на зімне-стойлавае ўтрыманне, а там, напрадвесні, глядзіш, не хопіць кармоў. Затым дадатковыя грошы спатрэбяцца на набыццё мінеральных угнаенняў для веснавой сяўбы, гаруча-змазачных матэрыялаў, запчастак і г.д. Замкнёнае кола. А вы можаце ўявіць, каб такім чынам улада збірала грошы для фермераў у Германіі, Польшчы, ЗША?

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

# Купляйце свежаніну, пакуль у цане...

*Выпраўляючыся ў прадуктовы шопінг на Камароўку (там усё крыху танней, чымся на астатніх сталічных рынках), пераканаўся, што цэны на мясныя прадукты не падскочылі разам з "ценявым" курсам долара і еўра. Хаця кожнаму вядома,што яны і так задраны па самае нельга і паўзуць уверх ледзь не штодня...*



Камароўка ў Мінску — індыкатар спажывецкай актыўнасці насельніцтва. Некалі нават у будні тут было не праціснуцца, асабліва бліжэй да восені, калі мінчукі вярталіся з адпачынкаў. Цяпер карціна некалькі іншая: народу паменела, затое, як і раней, усяго хапае, нават куры з'явіліся, якія тыднем раней невядома куды "адляцелі"... Ёсць ялавічына, свініна, нават маладая цяляцінка, не кажучы ўжо пра розную садавіну.

Прыцэньваючыся да свініны без костачкі (напраўду меў жаданне купіць якія два кіло), перакідваюся словам з гаспадыняй. Тая, адчуўшы смагу да свежаніны, пераконвае: "Даражэнькі, купляйце! Як з нашага Тарасава — нідзе лепшай свінінкі не знойдзеце: без адзінай пражылачкі, цана годная. Вунь вязуць адусюль, з усяе Беларусі, а мы побач — адразу за кальцавой. То хіба наша мяска не самае свежае?!" "Але не скажаш, што таннае, — устаўляю свае пяць капеек. — А кошты ва ўсіх, лічы, аднолькавыя — высокія..."

"Пасля 31-га будзе яшчэ даражэй, — не лезе за словам у кішэню кабета. — Дык лепш купіце сёння па 50 тысяч, чым праз якія тры дні невядома па колькі... Дзешавей не будзе, дакладна кажу вам..."

Успомніўшы маналог Карцава пра ракаў, якія "сёння па тры, але малыя, а заўтра па пяць і вялікія", бяру-такі тарасаўскую свініну па 50.800 рублёў за кіло. Можа, і праўда пасля 31-га (валютная ж інтрыга захоўваецца) цэны ўздыбяцца, нібы тыя хвалі, што набеглі на амерыканскае ўзбярэжжа?..

117 тысяч за два кіло свініны — і мой шопінг-бюджэт амаль вычарпаны. Раней (тры месяцы таму) на такую суму можна было атаварыцца пад завязку, а цяпер усё ўмясцілася ў адну авоську, якая сіратліва боўтнулася на донца гаспадарчай сумкі. Засталося яшчэ поўна месца для памідораў, зяленіва і капусты.

Пра цяляціну (па 75 тысяч за кіло) прыйшлося забыць наогул. І пра чырвоную траску (па 42 тысячы) таксама, і пра гарбушу, не кажучы ўжо пра сёмгу (99.990 рублёў за кіло!). Такая рыбка хіба ад смерці... Некалі на Камароўцы было шмат гандлёвых месцаў з рыбай, цяпер і паловы іх няма — прадаўцоў больш за пакупнікоў. Не дзіва...

На парозе восень, таму самы раз прыцаніцца да капусты і бульбы — спрадвечных выратавальнікаў нашых у найцяжэйшыя перыяды жыцця. А такія, падобна на тое, падкраліся, лічы, на парозе. Бульба, як і паўсюль у сталіцы, на Камароўцы не дарагая — у сярэднім па 2—3 тысячы за кіло. А капуста і ўвогуле па 1 тысячы... Значыцца, не прападзём, калі наквасім яе ўдосталь. Галоўнае, каб заакіянская "капуста" не зашкаліла пасля 31-га...

**Георгій ЧЫГІР.**
**Фота аўтара.**

ТРАГЕДЫЯ

## *Ад малой пачвары вялікая бяда*

*У Добрушскім раёне малады чалавек памёр ад укусаў шэршняў.*

30-гадовага жыхара вёскі Высокі Хутар насякомыя пакусалі ў двары ўласнага дома 28 жніўня.

Выратаваць яго ўрачы не здолелі. Мужчына памёр па дарозе ў бальніцу.

**БЕЗ КАМЕНТАРЫЯЎ**

## Мінэканомікі больш не можа спрагназаваць інфляцыю

Аб гэтым заявіў кіраўнік упраўлення макраэканамічнага аналізу **Антон Даўгавечны.**

Сярод прычын, якія не дазваляюць прагназаваць рост цэн у краіне, чыноўнік назваў множнасць валютных курсаў і дэвальвацыю, паведамляе БЕЛТА. Спадар Даўгавечны, аднак, заявіў, што рост коштаў у бліжэйшы час не спыніцца.

Нагадаем, што ад пачатку года інфляцыя ў Беларусі ўжо склала 46 працэнтаў.

**ДЕЛА ЖИТЕЙСКИЕ**

## С вещами на выход

*Жилищные службы Минска подали в суд более 100 исков на неплательщиков услуг ЖКХ.*

За январь—июнь текущего года жилищные службы Минска подали в суд 107 исков на переселение должников по оплате услуг ЖКХ в жилые помещения меньшей площади и 10 исков на выселение без предоставления жилья.

Из них, как сообщили корреспонденту агентства "Минск-Новости" в ГО "Минское городское жилищное хозяйство", удовлетворены 13 исков, касающихся только переселения. В менее комфортное жилье предстоит переехать двум нанимателям квартир из Заводского и двум — из Ленинского районов, а в Октябрьском районе сменят адреса сразу девять злостных неплательщиков.

По существующему законодательству переселить или выселить за большую задолженность по жилищно-коммунальным платежам и нарушение правил пользования жилым помещением можно только проживающих в государственных квартирах. Однако проектом нового Жилищного кодекса предусмотрена возможность продажи приватизированной квартиры и переселения в другую бывшего собственника. Ему будет выплачен остаток стоимости проданного жилья, получившийся после вычета стоимости передаваемого в собственность нового жилого помещения и затрат на погашение задолженности по платежам за жилищно-коммунальные услуги.

**ЧУЛІ?**

## Вяскоўцаў і сірот могуць пазбавіць ільгот пры паступленні ў ВНУ

*На гэта намякнуў "адказны" за ўступную кампанію Анатоль Рубінаў.*

"Ільгот на мазгі і на талент не павінна быць", — заявіў старшыня Савета Рэспублікі і дзяржкамісіі па кантролі за правядзеннем уступнай кампаніі Анатоль Рубінаў.

Вось як ён абгрунтаваў гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску:

*"На спецыяльнасць "Паліталогія" на бюджэт быў залічаны абітурыент, які набраў 112 балаў. А той, які набраў 337, не прайшоў. Тут трэба нешта мяняць. Дапамагаць трэба матэрыяльна, а льгот на мазгі і на талент не павінна быць".*

Рубінаў рэкамендаваў Міністэрству адукацыі прыраўняць умовы паступлення для абітурыентаў з вёсак і гарадоў. Маўляў, там узровень адукацыі аднолькавы.

**І ТАК БЫВАЕ**

## Паветка згарэла... з-за вады

Драўляная паветка згарэла на прыватным падворку ў вёсцы Гілікі Валожынскага раёна. Ніхто, акрамя гаспадароў, не звярнуў бы ўвагі на гэтае здарэнне, калі б не дзіўная прычына пажару.

Інспектар дзяржаўнага пажарнага нагляду райаддзела па надзвычайных сітуацыях **Алёна Корсакава** расказала мясцовай "Рэгіянальнай газеце", што пажар мог здарыцца ад цеплавога эфекту хімічнай рэакцыі негашанай вапны і вады.

Вада трапіла ў вапну, потым іскра — на салому, і адбылася трагедыя.

Матэрыяльная шкода, якую пажар нанёс 54-гадоваму гаспадару, ацэньваецца ў 35 мільёнаў рублёў.

**БУДЬТЕ ГОТОВЫ!**

## Бесплатная вакцинация от гриппа начнется с сентября

*Исходя из прогнозов о начале эпидемии гриппа, медики рекомендуют начать вакцинацию с сентября и завершить ее к 1 декабря*

Вакцинация за счет средств республиканского бюджета закончится к 1 ноября, сообщила главный эпидемиолог Министерства здравоохранения **Инна Карабан**.

Согласно прогнозам, в новом эпидсезоне будут циркулировать те же разновидности вирусов гриппа, что и в прошлом.

Для людей из группы риска, которых вакцинируют бесплатно в поликлиниках за счет средств республиканского бюджета, закуплена китайская вакцина. Поэтому бесплатно будут прививать преимущественно именно этой вакциной.

Сотрудники Минздрава смогли на собственном опыте убедиться в качестве и в эффективности китайской вакцины. Именно ею были привиты около 87% сотрудников Минздрава. Сообщается, что никто из привитых гриппом не заболел.

Напомним, что иммунитет после прививки от гриппа начинает снижаться примерно через 6—8 месяцев, поэтому прошлогодняя вакцинация уже не защитит.

**SOS!**

## Пить белорусы начинают с... детского сада

Специалисты Минского НИИ социально-экономических проблем подсчитали, что 15,4% детей впервые пробуют алкоголь в возрасте до 8 лет. А вообще, в статистику граждан, употребляющих алкоголь, уже попадают дети детсадовского возраста.

Как выяснилось, более половины школьников пьют шампанское. В семьях считается абсолютно нормальным поднять бокалы, например, "за Новый год". Чуть менее половины минчан школьного возраста употребляют полусухие вина.

## У Мазыры забаранілі мітынг-рэквіем

Прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі беларускіх яўрэяў (ЗША), ураджэнец Мазыра Якаў Гутман паведаміў, што Мазырскі гарвыканкам не дазволіў правесці мітынг у памяць пра яўрэяў, якія здзейснілі акт самаспалення падчас нацысцкай акупацыі горада.

Мітынг планавалася правесці 31 жніўня, у 70-ю гадавіну трагедыі. Па словах спадара Гутмана, улады Мазыра прапанавалі перанесці мітынг на 27 студзеня, калі адзначаецца Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту.

*Неяк незаўважанай аказалася сёлета ў нашай краіне дата 25 жніўня. Хоць на гэты раз яна была не простая, а юбілейная.*

*25 жніўня 1991 года дэпутаты Вярхоўнага Савета 12-га склікання надалі Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі статус канстытуцыйнага закона. Сапраўды акт гістарычнага значэння!*

*Друкуючы артыкул Зянона Пазьняка "Дзень незалежнасьці", "Народная Воля" такім чынам нагадвае сваім чытачам пра адну з найвялікшых падзей у нашай гісторыі змагання за волю і незалежнасць.*

*Артыкул друкуецца з захаваннем аўтарскай стылістыкі і арфаграфіі.*

*Зянон ПАЗЬНЯК*

# Дзень Незалежнасьці



**25 Жніўня 1991 года** ажыцьцявілася двухсотгадовая мара цэлых пакаленьняў беларускіх змагароў з расейскім заборам. У гэты гістарычны дзень пад напорам дэпутацкай Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце і пры падтрымцы тысячаў людзей на плошчы перад парлямантам была спынена дзейнасьць КПСС у нашай краіне і канстытуцыйна абʼяўлена незалежнасьць Беларусі. Ад часоў падзелу Рэчы Паспалітай і ліквідацыі Вялікага Княства Літоўскага — нашай магутнай дзяржавы — гэты дзень, 25 Жніўня, ёсьць рэальна найвялікшай датай нашай двухсотгадовай гісторыі змаганьня за волю і незалежнасьць. Ад гэтага часу незалежная Беларусь рэальна ёсьць, існуе як незалежная дзяржава, знаная ў сьвеце. Ужо дзеля дасягненьня аднаго гэтага варта было жыць. Засталося зрабіць завяршальны крок вялікай беларускай барацьбы — усталяваць у Беларусі беларускую ўладу.

У гэтым сутнасьць змаганьня з антыбеларускім рэжымам. Вораг залез у наш дом. Барацьба ўнутры. Будучыня, жыцьцё і сьмерць нацыі, існаваньне дзяржавы і незалежнасьці залежыць ад зыходу гэтай барацьбы, ад таго, хто вынесе трупы.

Перад кожным пакаленьнем беларусаў, народжаным у ілжы, стаіць вызваньне — зразумець, што ў змаганьні з імпэрскай Расеяй не было, няма і ня будзе ні кампрамісу, ні паловы, ні міру: альбо яна нас зьнішчыць, альбо выйдзем на вольны шлях і зробімся незьнішчальнымі.

Гэты шлях пачаўся адразу ў 1794, пасьля рэалізацыі змовы Эўропы (немцаў) з Расеяй — гэта значыць пасьля ліквідацыі ***Вялікага Княства Літоўскага*** і забору Беларусі. Гэты шлях праклаў ***Андрэй Тадэвуш Касьцюшка;*** па ім ішлі 197 гадоў. Ён вымашчаны мільёнамі ахвяр, палеглых за свабоду і волю, але бязь іх не было б 25 Сакавіка 1918-га, а без Сакавіка не настала б 25 Жніўня 1991-га.

Характэрнасць беларускага гістарычнага змаганьня супраць злачыннай і магутнай імпэрыі за волю і аднаўленьне дзяржавы палягае ў тым, што гэта заўсёды была барацьба авангарду. Таму паражэньні яго мелі страшныя вынікі для нацыі, а перамогі (Сакавік-1918, Жнівень-1991) успрымаліся як цуд, у які многія не маглі паверыць.

Думаючы пра гэты час, які побач, часта хочацца выказаць проста пачуцьці, калі б я не разумеў марнасць іх для новых людзей, што жывуць у другім вымярэньні. Відаць, найбольш дакладна і найпрасьцей сказаў пра нашыя адчуваньні Пётра Садоўскі, падпісаўшы мне кніжку пра свой "шыбалет": "Зянону на сьветлы ўспамін ад аўтара пра Час, калі мы былі гістарычна шчасьлівымі".

Тады, у пачатку 90-х, будучы ў Вярхоўным Савеце, калі гісторыя тварылася ледзь не кожны дзень, ніхто з нас, франтаўцаў (абсалютна ніхто), ні думаў пра сучаснасьць як пра гісторыю. Усе гарэлі ідэйнай мэтай і змаганьнем за гэтую мэту. Яна паглынала нас да рэшты. Часта трэба было дасягнуць немагчымага выніку неверагоднымі сродкамі. І мы, будучы ў абсалютнай мяншыні ў парляманце, дасягалі яго нават "нагамі" і рукамі сваіх апанентаў, не клапоцячыся пра ацэнкі і меркаваньні. Нам ня трэба было ні вядомасьці, ні папулярнасьці (тады палітыка не была яшчэ пошлым тэатрам), нам патрэбна была перамога, канец камунізму, незалежнасьць і самастойная Беларусь. Гэта мы здабылі, і гэта зрабіла нас "гістарычна шчасьлівымі".

Вопыт 90-х усім нам паказаў, наколькі значным робіцца час у пераломны момант гісторыі, як важна яго прадбачыць, адчуць наперад, імгненна скарыстаць. Беларуская камуністычная намэнклятура падтрымлівала ГКЧП, была заангажаваная ў путч. Калі б ён прадоўжыўся яшчэ дзень-два, усе гэтыя малафеевы *і К* актыўна вымкнуліся б на паверхню (гэбоўская Масква чакала іхняга дэмаршу). Але яны сьведама прамарудзілі, путч скончыўся, і намэнклятура ў Беларусі ўтрымала ўладу. (Тлумачу. Калі б яны агрэсіўна выявіліся, то пасьля путчу мы б іх вычысьцілі з улады ўсіх без астатку, скарыстаўшы тую ж ельцынскую Маскву.) Тым часам у дні путчу многія нашы намэнклятурныя дэпутаты-камуністы зрабіліся агрэсіўнымі, не хавалі сваёй радасьці і адкрыта казалі, што нас расстраляюць і ўсім нам "кірдык".

На раніцы 19 жніўня мы, дэпутаты Фронту, сабраліся ўсе ў Вярхоўным Савеце. Памяшканьне Апазыцыі БНФ стала штабам супраціўленьня путчу і ГКЧП.

Пасьля правалу путчу (21.08.1991) вельмі важна было імгненна сабраць сэсію Вярхоўнага Савета, пакуль у камуністычнай большасьці не мінуў шок, разгубленасьць і жах. Тут прышлося вытрымаць баталію і напіраць усімі сіламі, бо многія члены Прэзыдыюма ВС не разумелі, навошта сьпяшацца склікаць Сэсію. Але сэсію ўсё ж прызначылі на 24 жніўня.

22-га і 23-га жніўня мы, дэпутаты Апазыцыі БНФ, не выходзілі зь Вярхоўнага Савета і працавалі без перадышкі над плянамі, тактыкай дзеяньняў і над заканадаўчымі дакумантамі. Падрыхтавалі 14 заканадаўчых праектаў (гэта фантастычна — за суткі!).

Мы ўвайшлі ў залю пад Бел-Чырвона-Белым сьцягам. Першым чынам трэба было зьняць з пасады старшыню ВС М.Дземянцея. Я нават не чакаў такога напору ад дэпутатаў-франтаўцаў. Часам у залі стаяў такі рык, што здавалася Дземянцей нават жывым не застанецца. Ён чапляўся за пасаду, як тапелец за травічку, закасваў нават калашыну і паказваў голую лытку, каб усе бачылі, што ён быў ранены ў партызанах. Дземянцея зьнялі.

Быў яшчэ эпізод, калі аднекуль збоку на трыбуну раптам пасунуўся 1-ы сакратар ЦК КПБ Малафееў (ён ня быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР). Тут нашы дэпутаты паўскоквалі зь месцаў і пабеглі на яго, каб спыніць авантуру. Малафеева прагналі.

Назаўтра была спынена дзейнасьць КПСС і ЛКСМ у Беларусі. Пачаліся дэбаты аб абʼяўленьні незалежнасьці краіны. На плошчы перад парлямантам пэрманэнтна стаяла тысяч 30 людзей і крычалі: "Незалежнасьць! Незалежнасьць!".

(Нагадаю, што Дэклярацыя аб суверэнітэце Беларусі, прынятая 27 ліпеня 1990 года, сама па сабе яшчэ не забясьпечвала незалежнасьці, бо не была канстытуцыйным законам. Усяроўна кіравала Масква. Для дасягненьня незалежнасьці Беларусі патрэбна было надаць Дэклярацыі вагу і значэньне канстытуцыйнага закону.)

На другі дзень сэсіі, і асабліва ў канцы дня, я адчуў, што можам не набраць канстытуцыйную большасьць галасоў. У некаторых камуністаў пачаў малець страх, фармаваліся нейкія стыхійныя пазыцыі, намэнклятура паціху падымала галаву. Усе аргумэнты былі выказаныя, але іх для гэтай масы, што жыла падсьведамасьцю, магло быць замала.

Рашэньне прышло да мяне ў апошнюю секунду. Шушкевіч (якому Вярхоўны Савет даручыў весьці Сэсію) ужо стаў рыхтавацца абʼяўляць галасаваньне і (о, жах!) пачаў падыгрываць разгубленым настроям намэнклятуры. Ён публічна выказаў сумненьне, што пры галасаваньні ўдасца сабраць канстытуцыйную большасьць галасоў (гэта значыць — дзьве трэці), разважаў, што пытаньне будзе цяжка вырашыць. Словам, сеяў недавер у намэнклятурных галовах. (Гэта, дарэчы, быў заўсёдны ягоны згодніцкі стыль паводзінаў у тыя часы.) Тут узьнікала рэальная небясьпека (асабліва пры "канстытуцыйным" галасаваньні), бо некаторыя дэпутаты (і такіх было нямала) галасавалі так, як меркаваў і ставіў пытаньне вядучы Сэсіі.

Нават зьдзівіцца такім паводзінам Шушкевіча нам ужо не было часу. Я папрасіў апошняе слова і выступіў з засьцярогамі да ельцынскай палітыкі ў Расеі, кажучы, што адтуль нам усім пагроза, што на Усходзе фармуецца агрэсіўная імпэрыя ў форме дэмакратыі, што трэба стаць незалежнымі ад гэтай небясьпечнай для нас дэмакратыі і імпэрскай палітыкі. (Цалкам выступ прыведзены ў кнізе С.Навумчыка ***"Сем гадоў Адраджэньня альбо фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі", — Варшава—Прага, 2006 г., с.62—63).***

Я ведаў, што намэнклятура баялася, каб іх не дастала ў той сытуацыі рука Ельцына, і сваім выступам нагадаў ім пра гэта.

Пасьля выступу ўзьнікла яшчэ дыскусія, якая паказала, што словы мае дайшлі ўсё ж у іхнюю намэнклятурную пяту, дзе сядзела камуна-савецкая іхняя душа. **Галасаваньне адбылося трыумфальна: за незалежнасьць прагаласавала 253 дэпутаты з 265 зарэгістраваных у залі.** Многія так званыя "дэмакратычныя" дэпутаты, не зразумеўшы майго выступу, яшчэ доўга потым касавурыліся на мяне за крыўду іхняму куміру Ельцыну і "рускай дэмакратыі". Мяне гэта не хвалявала, "дэмакратам" розум ня ўставіш, тым больш, што пазьней і Ельцын, і Пуцін паказалі ўсім сваю імпэрскую "сутнасьць".

Позна вечарам (ужо сцямнела) закончылася Сэсія Вярхоўнага Савета і мы, дэпутаты Апазыцыі БНФ, выйшлі да людзей на плошчу. Усе радасна ўсклікалі, сьпявалі, сьмяяліся, плакалі ад шчасьця і абымаліся між сабой. Гарэлі агні, палілі газэты замест паходняў. Некаторыя, што не пасьпелі выйсьці з КПСС, тут жа спальвалі свае партбілеты, танцавалі, падскоквалі, як дзеці. Бацькаўшчына — незалежная!

Распад імпэрыяў у Эўропе адбываўся як працэс утварэньня незалежных нацыянальных дзяржаваў. Рухавіком працэсу была паўсюдна нацыянальная ідэя, якая разьвівалася па даволі строгай сістэме і ў рэчышчы агульнай заканамернасьці.

Гістарычныя падзеі апошняга часу ў Беларусі засьведчылі першаснасьць нацыянальнай ідэі, перавагу фэномену незалежнай дзяржавы над сістэмай улады. Нават калі ўлада антынацыянальная, яна ня можа фармальна ліквідаваць дзяржаву, бо ўлада без дзяржавы перастае існаваць.

Дзейнасьць антынацыянальнай улады ў Беларусі накіраваная на вынішчэньне нацыі і культуры па старых каляніяльна-рэпрэсіўных і русіфікацыйных схемах. З гэтага гледзішча антыбеларускі рэжым Лукашэнкі ёсьць крайне разбуральны для беларускай нацыі і ў канцовым сэнсе зьяўляецца пастаяннай пагрозай незалежнасьці нашай краіны.

Многие считают Кавказ стратегическим районом, связывающим Россию с нефтью Каспийского моря, и важнейшим элементом влияния на политику на Ближнем Востоке и в Центральной Азии. Сергей Арутюнов заявил, что Москва не может покинуть этот регион и по внутриполитическим причинам.

"Предоставление независимости одному какому-то региону на Кавказе повлечет за собой цепную реакцию, например, в том же Татарстане и в Башкирии, и к сепаратизму не только мусульманскому, но и к сепаратизму, скажем, чисто русскому, местническому сепаратизму на Дальнем Востоке. Там все время существует недовольство центральной властью. Там все время поддерживается настроение, что экономические связи, независимо от Москвы, с Китаем и Японией выгоднее, чем подчиняться московскому диктату..."

**Подготовил к печати Сергей ИВАНОВ.**

## *Начинается борьба за ливийскую нефть*

*В Триполи еще продолжаются боевые действия, а борьба за доступ к ливийским нефтяным запасам уже началась, пишет The New York Times.*

Еще до захвата власти повстанцы давали понять, что *"не забудут, кто их друзья, а кто враги, и переговоры будут вести соответственно". "У нас нет проблем с такими западными странами, как Италия, Франция и Великобритания,* — цитирует газета представителя подконтрольной восставшим нефтяной компании Agoco Абдельджалиля Майуфа. *— Но с такими странами, как Россия, Китай и Бразилия, могут возникнуть некоторые политические проблемы".*

Издание напоминает, что Россия, Китай и Бразилия, чьи крупные нефтяные компании стремятся к заключению контрактов в Африке, не поддержали строгие санкции в отношении режима Каддафи и выступали преимущественно за дипломатическое разрешение конфликта.

У IХ

## *З кішэні багатых, а не толькі бедных*

*Урад Францыі аб'явіў пра ўвядзенне мер, накіраваных на барацьбу з бюджэтным дэфіцытам. Тут не павышаюць цэны на прадукты і тавары, каб яшчэ больш не ўскладняць жыццё бедных, а павялічваюць падаткі для самых багатых грамадзян, а таксама акцызы на тытунь і алкаголь.*

Прэм'ер-міністр Францыі Франсуа Фіён мяркуе, што гэтыя меры дазволяць краіне сэканоміць у 2012 годзе 12 мільярдаў еўра, а бюджэтны дэфіцыт скароціцца да 4,5%.

Цяпер французы, якія зарабляюць у год больш за 500 тысяч еўра, будуць плаціць дадатковы трохпрацэнтны падатак да той пары, пакуль бюджэтны дэфіцыт краіны не скароціцца да планаваных 3%. Пры гэтым Франсуа Фіён заявіў, што Францыя дасягне гэтага паказчыка да 2013 года.

Вядома, што многія французскія аналітыкі баяцца зніжэння крэдытнага рэйтынгу Францыі. Гэта прывяло б да падзення акцый на еўрапейскіх рынках і пагаршэння даўгавога крызісу еўразоны.

СТОП-КАДР



**Родственники палестинского боевика, командира "Исламского джихада" Исмаэля Асмара, убитого израильскими военными во время рейда, скорбят на его похоронах.**

ПАЛІТКУХНЯ

## Прэтэндэнт пакуль адзін

*З'езд Партыі БНФ пройдзе 10—11 верасня ў Палацы культуры трактарнага завода.*

Мінгарвыканкам даў папярэдні вусны дазвол.

Пра гэта агенцтву БелаПАН паведаміў лідар партыі Аляксей Янукевіч. Па яго словах, афіцыйную паперу пра прадастаўленне памяшкання чыноўнікі абяцалі даслаць на гэтым тыдні.

На з'ездзе партыйцы павінны абраць новае кіраўніцтва, прыняць змены ў статут, а таксама стратэгію дзейнасці на бліжэйшыя два гады. Дарэчы, змены ў статут Партыі БНФ абмяжуюць старшынства ў ёй двума тэрмінамі. Акрамя таго, плануецца павялічыць тэрмін старшынства ў партыі з двух да трох гадоў.

Што ж тычыцца "персанальнага пытання" аб лідарстве ў партыі, то, як паведаміў першы намеснік старшыні Рыгор Кастусёў, *"пакуль што ніхто, акрамя Янукевіча, жадання вылучацца на пасаду старшыни партыі не агучыў. Ёсць верагоднасць, што хтосьці захоча вылучыцца, ды і на самім з'ездзе могуць узнікнуць прапановы. Так што нельга адназначна казаць, што Янукевіч — адзіная кандыдатура. Усё можа быць..."*

Дарэчы, сам Рыгор Кастусёў балатавацца на пасаду старшыні не збіраецца.

**Алег СНОЎ.**

### ТЫМ ЧАСАМ

Трое актывістаў Партыі БНФ трапілі пад крымінальную справу. Іх абвінавачваюць у збіцці ахоўніка будынка, дзе зараз месціцца офіс партыі.

Алесь Каліта, Сяргей Семянюк і Максім Губарэвіч даведаліся пра гэта ад следчага, які выклікаў іх на допыты.

Партыйцы перакананы, што ў дачыненні да іх была ўчынена правакацыя. Хаця прызнаюць, што інцыдэнт меў месца: п'яны ахоўнік у пазапрацоўны час чапляўся да актывістаў Партыі БНФ, якія прыехалі на сойм. Як паясняе Сяргей Семянюк, мужчыну спынілі, вывелі з будынка і пасадзілі ў таксі. Але на наступны дзень ахоўнік напісаў данясенне, што яго збілі.

Каліце, Губарэвічу і Семенюку пагражае пазбаўленне волі. Гэта справа вельмі падобная на тую, калі за "збіццё" таямнічых людзей, якія нават у судзе не хацелі называцца і вялі сябе нахабна, трапілі за краты Зміцер Дашкевіч і Эдуард Лобаў.

РЕЙТИНГ

## Беларусь попала в индекс самых несчастных стран мира

*Беларусь впервые попала в мировой индекс несчастья и уверенно заняла там место самой несчастной страны, вытеснив с него Украину.*

Индекс несчастья (иногда его называют индекс невзгод — Misery Index) был введен в 70-х годах прошлого века американским экономистом Артуром Окуном, который для вычисления индекса предложил складывать инфляцию и безработицу, поскольку именно они больнее всего бьют по благополучию простых граждан.

Большинство стран попали в конец рейтинга из-за высокой безработицы. Только Республика Беларусь, впервые попавшая в список, оказалась самой несчастной благодаря сверхвысокой инфляции, вызванной экономическим кризисом.

Норвегия — страна с нулевой инфляцией — самая счастливая. Следом идут Швейцария и Япония.

Россия впервые обогнала США по показателю "несчастья" и стала чуть более счастливой — 11,3 балла против 11,7.

Стоит напомнить, что еще в 2010 году Беларусь занимала неплохие места в рейтингах счастливых стран.

ПЕРСОНА

# Частный воспитатель

## 25 вопросов педагогу, который считает, что в такой профессии следует быть "ясновидящей"

*Понятие детства существовало в мире далеко не всегда. Например, греческая античность не знала детства как особой возрастной категории. В Древней Греции не существовало моральных или правовых запретов на детоубийство. Отношение к детям, по современным меркам, было весьма жестоким. Аристотель, например, одобрял практику "отбраковки" неполноценных детей.*

*В римской античной культуре детство как период жизни выделяется уже более отчетливо. По крайней мере, взрослые скрывали от детей некоторые стороны своей жизни... Существовало понятие стыда. Но средневековье вновь отбирает детство у человечества. В эпоху неразвитой медицины, когда, по выражению известного американского социолога Постмана, основным делом детей было умирать и выживали единицы, у взрослых отсутствовал психологический комплекс сопереживания детям. Пока ребенок не вырастал и не доказывал свою жизнеспособность, он попросту не вызывал у родителей особого внимания и интереса. А вот семилетний мальчик уже считался маленьким мужчиной. Католическая церковь считала этот возраст рубежом, после которого человек способен отличать добро от зла, и судила детей, даже подвергала пыткам наравне со взрослыми.*

*Лишь Возрождение — вместе с культом образованного человека — вернуло нашей цивилизации детство и, прежде всего, увеличило его во времени. Детей снова начали "школить", то есть долго и кропотливо обучать. А ответственность за воспитание детей возложили на взрослых.*

*С тех пор забота о потомстве — одна из главных задач общества. Растя детей, взрослый человек — в известном смысле — проявляет себя наиболее полно. Рисуя желаемый будущий образ ребенка, мы, по сути, сообщаем все о себе. Мы постоянно совершенствуем учреждения, в которых растим и воспитываем своих детей. Так, в нашей стране появились частные детские сады. Я беседую с директором такого учреждения —* ***Галиной Иосифовной ГРИНКЕВИЧ****. Частный детсад* ***"Ребенок будущего",*** *которым она руководит, открылся в Минске почти 20 лет назад — он один из первых успешных (!) примеров альтернативы государственному дошкольному воспитанию.*

1. **— Галина Иосифовна, в частном образовании и воспитании вы работаете 20 лет. Положа руку на сердце, образование в частных школах действительно лучше, чем в государственных?**

— Я не стану обобщать... Но когда-то, в свое время, я перевела сына после 8-го класса из частной в государственную гимназию. Почему? Результаты на поверку оказались не такие блестящие, как стояли в дневнике. Хотя преподавали отличные педагоги. В частных структурах детей очень жалеют и порой завышают им оценки.

2. **— А что в дошкольном учреждении, в детском саду? Родители вами довольны?**

— Собственно, мы зависим от заказа родителей. Когда они приводят ребенка, мы откровенно проговариваем наши задачи и обязанности. Если они не хотят слышать ничего плохого о ребенке — ради Бога. Но если хотят, чтобы мы совместными усилиями из него что-то вылепили, то, говорю я, давайте работать рука об руку и честно обсуждать все проблемы. В общем, все зависит от заказчика.

3. **— Выходит, вы — сфера обслуживания?**

— Так и есть. Наше детское дошкольное учреждение — частное предприятие по оказанию услуг. Но если кому-то кажется, что копаться в песочнице — милое дело, он ошибается. Детсад — это тяжелый труд, потому что подразумевает постоянный контакт с людьми, не всегда безоблачный, дети всяко вытворяют.

4. **— А вы себя кем ощущаете в большей степени: педагогом или менеджером? Воспитателем или бизнесменом?**

— Одного определения мне точно недостаточно. Никогда не думала, что я попаду в дошкольный мир и буду этим увлеченно заниматься. Но знаете, почему я здесь задержалась? В саду я полностью себя реализовала: все-все свои способности. И творческие задатки, и хозяйственные. Состоялась и как педагог.

5. **— Тогда по порядку. Чего ждут родители от частного воспитания?**

— Нередко они приходят в частный детсад с проблемой, о которой поначалу даже не говорят. Много детей — процентов 60-70 — уже побывали в государственных садиках и... не прижились там. Причем не самые худшие детки. Но... не сложилось, попали в плохую среду — детскую ли, взрослую (жестокие воспитатели, думаете, редкость?). До нервного срыва у ребенка доходит — ни слышать, ни видеть не хочет детсад. Поэтому родители ведут его в частное заведение — хотят отдать дитя в надежные руки.

6. **— А что ценят больше: хороший уход или знания, которые вы даете?**

— Культ знаний — это веяние времени. Взрослые хотят, чтобы дети не только хорошо спали-ели, но и многому научились уже до школы. У нас каждый день по 5—6 занятий: иностранный, шахматы, музыка, рисование. Но, помимо того, детей водят в кружки дополнительно после сада! Одна девочка, например, учит китайский язык. Многие учатся хореографии, плаванию, теннису. Детей сейчас нагружают! Родители хотят, чтобы дети были успешными в будущем. Поэтому нам ставят такую цель: надо поступить в хорошую школу — подготовьте. Все нацелены на хорошую школу. Что это значит? С хорошим, требовательным педсоставом, с хорошим контингентом детей. Среда очень важна. Те, у кого сегодня есть средства, хотят, чтобы ребенок жил среди достойных людей. И состоялся, повторю, как успешный человек.



### ДОСЬЕ «НАРОДНОЙ ВОЛИ»

*Галина Иосифовна ГРИНКЕВИЧ родилась в Минске в семье потомственных строителей. Окончила школу с золотой медалью. Занималась музыкой и спортом. Получила два высших образования: журналиста и педагога. Работала директором частной гимназии. С 2006 года — директор и учредитель частного дошкольного учреждения "Ребенок будущего".*

7. **— А конфликты, проблемы? Каков их характер в частном учреждении?**

— Как во всем мире — непонимание. Не всегда родители говорят нам правду: откуда истоки поведения ребенка? И мы не вправе лезть в частную жизнь семьи. И порой бьешься, бьешься и не понимаешь, почему ребенок себя так ведет. Например, немотивированная агрессия — эта проблема обычно из семьи. Но разве родители откровенно расскажут о своих отношениях? Это одна сторона. Другая — здоровье: "Вы его простудили!" Как правило, такие заявления мы слышим после выходных. Но за годы работы я заметила: в понедельник детей в саду на 5 человек меньше, чем обычно. Так кто простудил ребенка?.. Но, если честно, эти конфликты не острые.

8. **— Сколько детей в вашем "питомнике"?**

— Цифра плавающая. В этом году, согласно плану, в двух группах будет 18 и 20. По наметкам.

9. **— Какие требования вы предъявляете к работникам? Кроме диплома о высшем образовании, естественно.**

— А вот знаете, с таким огромным опытом становишься "ясновидящей". Но если сомневаюсь, предлагаю человеку поработать, выйти на смену. А я рядом стою, наблюдаю. Это помимо первой встречи. Она, кстати, важна. Потому что воспитатель должен нравиться окружающим с первого взгляда. Он должен быть обаятельным. Недавно общалась с опытным педагогом: культурный человек, речь прекрасная... Но внешний вид... Она зашла — я поежилась. А дети? Я ей честно сказала: меня смущает ваш внешний вид и возраст. В дошкольном мире это важно. Так что видите, требований к работникам много: профессионализм, возраст, внешний вид, негромкий голос — дети не должны пугаться.

10. **— А какие требования к воспитателям у родителей? Они платят и хотят диктовать условия. Бывает?**

— Да. Норовят продиктовать, кого убрать, кого поставить. Я обычно пресекаю, потому что это уже не их прерогатива: мне виднее в этом вопросе.

11. **— Интересно, кто приводит детей в частный сад? Социальное положение родителей?**

— Директора собственных предприятий, главные бухгалтеры крупных предприятий, служащие посольств, представители иностранных банков, иностранные граждане, работающие у нас по контракту, спортсмены. И люди, которые не называют род своей деятельности. Но в частную жизнь мы не лезем. А еще есть семьи, где за частный детский сад платят дедушки-бабушки.

12. **— Среди частных садов большая конкуренция?**

— В центре города — пожалуй. Но еще есть такой сегмент рынка, как нелегальные дошкольные предприятия: на квартирах, в коттеджах, где всего по 5—6 детей.

13. **— Это выгоднее?**

— Это очень опасно, шатко — пока сосед не капнет, грубо говоря. Но самый серьезный вопрос не в налогах. Главное в дошкольном учреждении — детское питание. Мы относимся к высокой группе риска, санстанция нас комплексно проверяет каждый год, делает анализ питания: чтобы в рационе хватало белков, углеводов. Проверяет, как хранятся продукты. Конечно, с этим не все хотят связываться. Но все до поры, до времени. А не дай бог отравление? Ротовирусная инфекция сплошь и рядом... И врачи тут же передадут данные в санстанцию. Поэтому устраивать где-то детсад нелегально я бы никому не посоветовала. Да и родители не спустят, если что.

14. **— А большая разница в оплате труда у работников государственного сада и частного?**

— Разница, конечно, большая. В разы. Есть смысл работать и стараться.

15. **— Вы часто говорите с детьми о доброте?**

— Конечно. Ведь педагогам то и дело приходится разбирать межличностные конфликты. У меня была девочка — умненькая, успевала по всем наукам, но жадная, нехорошая по натуре. И папа однажды говорит: "Вы не замечали, что-то с моей дочерью?.." — "Эгоизм, жадность... — отвечаю я. — А вы только сейчас это увидели?" — "Да". И мы вместе попробовали целенаправленно с этим бороться. Родители стали приносить в сад дорогие подарки, чтобы дочка отдавала их друзьям. В общем, повели себя педагогически правильно и девочку, я считаю, спасли. В дошкольном возрасте человека еще можно перевоспитать.

16. **— Вы можете предсказать лидеров в этом возрасте?**

— Они у нас практически все лидеры, потому что из семей лидеров. В старшей группе все время идет конкурентная борьба. Каждый "звезда".

17. **— Какие у вас впечатления о состоянии современной семьи? Вы же на нее смотрите с самого незащищенного угла — через детей. А дети — слепки со взрослых.**

— Во все времена семьи делятся на счастливые и нет. Несчастливые похожи. А вот счастливые сейчас — уникальны. (Хотя Лев Толстой писал наоборот.) Нынче много поздних браков, семей, где родители зрелого возраста, где родители уже дедушки и бабушки — это вторые, третьи браки. У них четвертые, пятые дети. Кутают, балуют своих чад — у таких родителей к ребенку слепая любовь, и это мешает правильному воспитанию. Как раз молодые мамы ведут себя педагогически более верно и чаще прислушиваются к советам.

18. **— Интересно, с какого возраста дети начинают говорить о деньгах?**

— Дошколята еще не понимают, что такое цена. Они далеки от этой темы. Мы пытались с ними играть в магазин, я поняла, что рано. Они легко расстаются с дорогой игрушкой и ни за что не отдают порой свой рисунок. Другие ценности.

19. **— Должны ли дети рано учиться читать? Возможно, мы слишком рано лишаем их слухового, воображаемого мира...**

— Я сторонник раннего развития ребенка. Время у нас сейчас такое: информативное, скоростное.

20. **— А когда вы начинаете говорить о труде?**

— Как приходит ребенок к нам в детсад, так и начинаем говорить. Поиграл — убери игрушки, поел — отнеси посуду в моечную, одень себя сам (это к 5 годам). В саду есть живой уголок, дети с воспитателями ухаживают за животными. Я не знаю — вернее, знаю! — почему ушла эта традиция из государственных садов. Потому что это большой труд, который прежде всего ложится на плечи взрослых. А у нас живут птички, кролик. Спросите, где еще они есть. Мы вместе с детьми за ними ухаживаем: клетку моем, к ветеринару возим, коготочки обрезаем. Дети нарывают одуванчиков — Степашку покормить. Попугайчикам приносят из дома отварное яйцо. Это самая хорошая трудотерапия.

21. **— Как к вам относятся наши государственные органы?**

— Неплохо. Они видят, что на наши услуги есть спрос, значит, со своими задачами мы справляемся неплохо. Опять же, ничего не просим, а пользу приносим: аренду платим, налоги, обеспечиваем работой людей. Из Министерства образования однажды меня даже приглашали на международную конференцию.

22. **— А вот как быть с религиозным воспитанием? Как вы считаете, надо говорить с детьми о христианстве?**

— В детском саду? Тонкий вопрос. Я пока не взялась за эту тему.

23. **— Имеют ли право родители наказывать детей физически?**

— Нет. Это преступление. А тем более наказания в саду. Максимум, что мы делаем, сажаем ребенка на пуфик. И не в угол, а у стеночки. И это действенно. Физическое наказание не приносит пользы. Это от педагогической беспомощности. Я часто повторяю (родителям в том числе) такие слова: "Берегите слезы своих детей, дабы они могли их проливать на вашей могиле".

24. **— А какой период у человека самый лучший? Как вы сами считаете?**

— Все-таки первая юность. Здоров, беззаботен, еще не знаешь цену деньгам. И все близкие живы...

25. **— А детство?**

— Оно плохо помнится, лишь в общих чертах — наше самое первое детство. Но, глядя на своих воспитанников в детском саду, я им завидую.

**Елена МОЛОЧКО.**

ГУЧНЫЯ СПРАВЫ

## За што яны адседзелі ў СІЗА КДБ?

Як мы паведамлялі ў мінулым нумары, справа ў дачыненні да старшыні АГП Анатоля Лябедзькі, узбуджаная пасля падзей 19 снежня, спынена з-за адсутнасці складу злачынства.

Дакумент аб спыненні крымінальнага пераследу атрымалі і бацькі рэдактара сайта "Хартыя'97" Наталлі Радзінай, якая таксама была арыштавана 19 снежня, але пасля вызвалення "пад падпіску" здолела выехаць у Літву.

Наталля да навіны паставілася скептычна.

— Пачуўшы па тэлефоне ад мамы гэты тэкст, я на радасцях гатова была бегчы да беларускай мяжы. Але своечасова ўспомніла, што пасля паўтара месяца ў турме ні МУС, ні КДБ не вярнулі мне пашпарт, — родныя памежнікі могуць і не прызнаць. А потым патэлефанавалі юрысты і ахаладзілі мой запал, — адзначыла Наталля Радзіна. — Паводле іх слоў, спыненне крымінальнай справы па артыкуле 293 КК (масавыя беспарадкі) не азначае адсутнасці крымінальнай справы па артыкуле 342 КК (удзел у групавых дзеяннях, якія парушаюць грамадскі парадак). Як вядома, супраць Дзмітрыя Бандарэнкі, Ірыны Халіп, Анастасіі Палажанка, Уладзіміра Някляева, Андрэя Дзмітрыева, Аляксандра Фядуты, Віталя Рымашэўскага, Сяргея Вазняка, Паўла Севярынца, Сяргея Марцалева справа за „масавыя беспарадкі" таксама была спынена, але потым распачата новая.

У любым выпадку застаецца пытанне: хто адкажа за тое, што Наталлю і Анатоля доўгі час утрымлівалі ў СІЗА КДБ, калі ў выніку ніякага складу злачынства ў іх дзеяннях не знойдзена? Пра што, дарэчы, гаварылася і пісалася з першых жа дзён гэтага "дзікага палявання".

**Ірына МАЛЬЦАВА.**

ЦЭНЫ

## Услед за бензінам даражэе звадкаваны газ

З 1 верасня цэны на звадкаваны газ на аўтамабільных запраўках у Беларусі павышаюцца на 9,8%.

Пра гэта гаворыцца ў пастанове Міністэрства эканомікі ад 19 жніўня, паведамляюць інфармагенцтвы. Мінімальная цана за літр будзе 2370 рублёў, максімальная — 2800. За жнівень звадкаваны газ падаражэў на 24%.

## Усё вельмі добра, але грошай няма

Фінансаванне дзяржпраграм скарацілася на 10 трыльёнаў рублёў. І трэба скараціць яшчэ на 5 трыльёнаў.

Аб такім значным зацягванні паясоў паведаміў журналістам начальнік галоўнага ўпраўлення макраэканамічнага аналізу і прагназавання Міністэрства эканомікі **Антон Даўгавечны.**

СУСЕДЗІ

## На беларуска-польскай мяжы з'явіцца новы пункт пропуску

Новы пункт пропуску "Дамачава" на беларуска-польскай мяжы, што за 45 км ад Брэста, адкрыецца 20 верасня. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта **Юрый Брыткоў.**

Паводле слоў прадстаўніка камітэта, пункт будзе арыентаваны на пропуск фізічных асоб. Але *"таксама праз гэты пункт пропуску будуць мець магчымасць перамяшчацца транспартныя сродкі грузападымальнасцю 3,5 тоны і пасажырскія мікрааўтобусы ёмістасцю да дзевяці чалавек",* удакладніў Брыткоў.

Прадстаўнікі ДМК паведамілі пра тэндэнцыю скарачэння спроб незаконнага вывазу за межы краіны паліва і сацыяльна значных спажывецкіх тавараў, вываз якіх абмежаваны чэрвеньскімі пастановамі ўрада №№753 і 755. Калі ў першыя дні дзеяння гэтых пастаноў праз мытную мяжу за суткі перамяшчалася да 11 тысяч фізічных асоб, то цяпер — прыкладна 9 тысяч чалавек, сказаў Брыткоў.

ПАДЛІЧЫЛІ

## Колькасць жыхароў Беларусі працягвае змяншацца

За студзень—ліпень 2011 года колькасць жыхароў краіны зменшылася на 13,6 тысячы чалавек. На 1 жніўня нас было ўжо 9 мільёнаў 467,3 тысячы чалавек.

Згодна з афіцыйнай статыстыкай, за гэты час у краіну прыбыло 9772, а з'ехала — 3641 чалавек.

Скарачэнне колькасці насельніцтва адбываецца ў выніку перавышэння колькасці памерлых над колькасцю народжаных.

Толькі ў Мінску колькасць насельніцтва вырасла на 3 тысячы чалавек, ва ўсіх астатніх рэгіёнах гэты паказчык знізіўся.

## Дзеці — лішнія?

Амаль 40% беларускіх сем'яў складаюцца з двух чалавек. Пра гэта паведамілі ў інфармацыйным цэнтры Фонду ААН у галіне народанасельніцтва "Свет сямі мільярдаў".

Паводле звестак перапісу насельніцтва 2009 года, пераважным тыпам сям'і па-ранейшаму застаецца сямейная пара з дзецьмі ва ўзросце да 18 гадоў — іх налічваецца амаль 680 тыс., або 25% ад агульнай колькасці сем'яў.

Сем'яў, якія складаюцца з маці з дзецьмі ва ўзросце да 18 гадоў, амаль 158 тысяч, бацькоў з дзецьмі — больш за 12 тысяч.

У краіне налічваецца 3 млн 873 тыс. прыватных домагаспадарак. Пры гэтым істотна знізілася колькасць домагаспадарак, якія маюць у сваім складзе дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў. У 2009 годзе іх налічвалася больш як 1 млн 250 тыс., або 32% ад агульнай колькасці. У параўнанні з папярэднім перапісам насельніцтва гэты паказчык зменшыўся на 369 тысяч.

## Бум крадзяжоў

*На Гомельшчыне ў гэтым годзе было скрадзена амаль 300 ровараў.*

Як паведамляе БелаПАН, часцей за ўсё ровары крадуць у сельскіх раёнах, дзе людзі часцей на іх ездзяць. Шкода, якую прычынілі злодзеі, складае больш за 136 мільёнаў рублёў. Як кажуць міліцыянеры, кожны трэці ровар крадуць у шматкватэрных дамах, кожны чацвёрты — на вуліцах.

ЗОРКІ Ў ГАСЦЯХ "НАРОДНАЙ ВОЛІ"

*Уладзімір ПАРФЯНОВІЧ:*

# «Як алімпійскі чэмпіён ад Беларусі я не атрымліваю ні капейкі...»

*Праслаўлены беларускі вясляр, які зараз працуе ў Расіі, адказаў на пытанні карэспандэнта "Народнай Волі".*



Сем гадоў таму, летам 2004 года, трохразовы алімпійскі чэмпіён у веславанні Уладзімір Парфяновіч быў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Дэпутатам, які не маўчаў, а адкрыта ставіў нязручныя пытанні перад самымі высокімі чыноўнікамі. Такія ў нас не ў пашане. Рысу пад дэпутацкай кар'ерай Уладзіміра Уладзіміравіча падвёў удзел у галадоўцы. Ён, генерал Валерый Фралоў і буйны ў тыя часы бізнесмен Сяргей Скрабец галадалі, патрабуючы змен у выбарчае заканадаўства Беларусі... Дэпутаты тады свайго дабіліся, пытанне было вынесена на галасаванне, але не падтрымана іншымі "народнымі абраннікамі".

Пасля гэтага імя Парфяновіча, роўна як і іншых "бунтаўшчыкоў", трапіла пад забарону ў Беларусі. Уладзіміра Уладзіміравіча выключылі са складу Нацыянальнага алімпійскага камітэта "за дыскрэдытацыю алімпійскага руху", праўда, яшчэ некаторы час пасля гэтага НАК Беларусі спраўна высылаў яму разнастайныя юбілейныя медалі...

Амаль два гады таму славуты беларускі вясляр, веды і ўменні якога тут, у Беларусі, аказаліся не патрэбнымі, з'ехаў у суседнюю Расію, дзе яму прапанавалі ўзначаліць расійскую каманду. У Мінску Парфяновіч зараз бывае наездамі — раз на тры-чатыры месяцы.

На мінулым тыдні Уладзімір Уладзіміравіч прыехаў у беларускую сталіцу пасля чэмпіянату свету ў Сербіі...

**— Уладзімір Уладзіміравіч, як вам працуецца ў Расіі?**

— Грэх скардзіцца, нармальна працуецца. У мае абавязкі ўваходзіць падрыхтоўка ўсіх нацыянальных расійскіх зборных — дарослых, юнакоў і юніёраў. Адказваю за іх выступленні. Пасада, якую я займаю, называецца "памочнік прэзідэнта федэрацыі". Дадаткова я з'яўляюся старшым трэнерам дарослай зборнай па байдарцы.

**— Як вашы падначаленыя выступілі на прайшоўшым у Сербіі чэмпіянаце свету?**

— Даволі паспяхова выступілі. Заваявалі 11 медалёў, і з 18 магчымых алімпійскіх ліцэнзій расійскія весляры ўзялі 15. Задачы перад намі ставяцца самыя сур'ёзныя — з Алімпіяды ў Лондане мы плануем прывезці 2 залатыя, 2 сярэбраныя і 2 бронзавыя медалі. Гэтая задача камандзе цалкам пад сілу. У Расіі перад спартсменамі задачы ставяцца наступным чынам: ніхто не кажа, што "вы павінны, кроў з носа" прывезці пэўную колькасць медалёў. Там ёсць разуменне, што ў спорце можа быць усялякае...

Дарэчы, на міжнародных спаборніцтвах, канечне ж, кантачым і па-ранейшаму сябруем з беларусамі, якія мне, зразумела, не чужыя. Перажываў за тое, што беларуская "шасцёрка" не трапіла на Алімпіяду... Але гэта спорт...

**— Уладзімір Уладзіміравіч, можа быць, за час, што вы працуеце ў Расіі, нехта з беларускіх чыноўнікаў ад спорту выходзіў на вас з прапановай вярнуцца на радзіму і трэніраваць беларускіх весляроў?..**

— Не, такой прапановы не было, і наўрад ці ў бліжэйшы час яна паступіць... Па шчырасці, калі б прапанавалі вярнуцца, я абдумаў бы такую прапанову, выставіў бы пэўныя ўмовы. Не, не фінансавыя, а хутчэй маральна-чалавечыя. Размееце, ніхто мяне клікаць назад не будзе, бо ў Беларусі істотна за апошнія гады нічога не памянялася. Ні ў палітычным, ні ў астатніх планах. Я, са свайго боку, не памяняўся як чалавек, застаўшыся пры сваіх поглядах і перакананнях...

**— Дарэчы, вы як алімпійскі чэмпіён па-ранейшаму нічога не атрымліваеце ў Беларусі?**

— Не, і гэта не дзіўна. У Беларусі дагэтуль няма адпведнага закона, які гарантаваў бы ўтрыманне алімпійскіх чэмпіёнаў пасля заканчэння выступленняў. Такі закон ёсць у Расіі і нават у маленькай Літве, кожны алімпійскі чэмпіён, якіх там, можа, не так шмат, атрымлівае ад дзяржавы 1000 еўра штомесяц. Беларусь у гэтым сэнсе стаіць асобна. Ты на кані і ў пашане толькі тады, калі нешта выйграеш, а як толькі заканчваеш кар'еру — робішся дзяржаве непатрэбным... Я лічу, што гэта няправільна.

**— У свой час вы марылі аб стварэнні ў Беларусі клуба алімпійскіх чэмпіёнаў...**

— Гэтая мара так і засталася нерэалізаванай. З падобнай прапановай выходзіў не толькі я, а і алімпійскі чэмпіён у фехтаванні Віктар Сядзяк і іншыя вядомыя і праслаўленыя спартсмены. Так і не створаная арганізацыя ставіла перад сабой на мэце абарону інтарэсаў алімпійцаў Беларусі. Але нам канкрэтна і папулярна растлумачылі: "Хлопцы, ёсць Нацыянальны алімпійскі камітэт, і гэтага хопіць!" Не ведаю, чаму нам так і не далі стварыць клуб алімпійскіх чэмпіёнаў. Магу толькі здагадвацца, што нехта спужаўся, што алімпійскія чэмпіёны маюць вагу і вядомасць у грамадстве і, безумоўна, будуць мець свой голас. А ў Беларусі сапраўдны голас павінен мець толькі адзін чалавек... І ўсе мы яго цудоўна ведаем...

**— Можа, не будзем пра палітыку?..**

— Можам і не гаварыць... Але гэта не палітыка нават — гэта жыццё. Жыццё цэлага народа пры ўладзе аднаго чалавека. Мы і галадалі ў 2004-м супраць гэтага, па сутнасці...

А зараз... Вы ж у крамы мінскія ходзіце? Вось і я, прыехаўшы ў Мінск, зайшоў... Гэта шок! Апошнім разам я быў у беларускай сталіцы чатыры месяцы таму. Такога не было. Цэнікі нейкія завоблачныя! Адкуль такія кошты на прадукты? Беларусь ужо дагнала, а ў некаторым сэнсе і перагнала тую ж Расію ў коштах на прадукты. Праўда, з даходамі ў беларусаў горш. Вось, напрыклад, пенсія маёй мамы 800 тысяч рублёў. І як за гэтыя грошы людзям жыць? Але пры гэтым беларусам, якія ходзяць у крамы, расказваюць, што жывуць яны ўсё лепш і лепш... Не ведаю, на каго гэта разлічана, аднак верыць у гэта цяжка. Але, каб на песімістычнай ноце не заканчваць, скажу: ёсць вера, што рана ці позна гэта скончыцца, бо ўсё ў рэшце рэшт заканчваецца...

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

ВОКРУГ СПОРТА

## Месси — лучший футболист Европы

*Первым обладателем звания лучшего футболиста Европы по версии УЕФА стал нападающий "Барселоны" Лионель Месси.*



Лучшего футболиста сезона-2010/2011 определили 53 спортивных журналиста, представляющие национальные ассоциации УЕФА. За Месси проголосовали 38 человек, и он намного опередил своих конкурентов — одноклубника Хави Эрнандеса (11 голосов) и игрока "Реала" Криштиану Роналду (3 голоса).

В десятку лучших вошли еще два футболиста "Барселоны" — Андрес Иньеста и Жерар Пике. Также за престижную награду боролись Фалькао ("Порту", позднее перешел в "Атлетико Мадрид"), Уэйн Руни и Неманья Видич ("Манчестер Юнайтед"), Златан Ибрагимович ("Милан") и Мануэль Нойер ("Шальке-04", позднее перешел в "Баварию").

В прошлом сезоне Лионель Месси забил за "Барселону" 53 гола. В частности, он забил 12 голов в Лиге чемпионов и в третий раз подряд стал лучшим бомбардиром турнира.

УЕФА учредил приз лучшему футболисту Европы в июле 2011 года. Эта награда заменила приз лучшему игроку года в клубном футболе (в 2009 году он достался тому же Месси). Теперь при голосовании учитываются выступления футболистов во всех национальных и международных турнирах на уровне как клубов, так и сборных.

## Судья чуть не попал... под инвалидное кресло

*Болельщик голландского футбольного клуба "Осс", передвигающийся на специальном скутере для инвалидов, попытался задавить главного арбитра, судившего матч его команды с "Алмере Сити". По окончании встречи, когда рефери Эдвин ван де Граф покидал поле, болельщик дважды совершил на него наезд, сообщает издание The Score.*



Ван де Граф избежал травм, и инцидент, запись которого выложена на сайте YouTube, продолжения не получил. Матч второго дивизиона чемпионата Голландии "Осс"—"Алмере Сити" состоялся 19 августа и завершился поражением "Осса" со счетом 3:4, причем по ходу встречи команда уступала 0:4.

Чем именно был недоволен болельщик "Осса", не уточняется. Как отмечает интернет-издание Soccerway.com, ван де Граф показал игрокам "Осса" шесть желтых карточек, а в составе "Алмере Сити" предупреждение получил лишь один футболист.

## Олимпийский чемпион покончил с собой

*Во Франции покончил с собой олимпийский чемпион 1984 года по прыжкам с шестом Пьер Кинон. Об этом сообщила сегодня Французская федерация легкой атлетики. Ему было всего 49 лет.*

По факту самоубийства спортсмена прокуратурой города Тулон начато следствие.

Завершив карьеру в 1992 году, Кинон проживал на юге Франции, в департаменте Вар. После ухода из спорта он занялся бизнесом. Впрочем, в последние годы Кинон вернулся в мир легкой атлетики. Он принимал активное участие в подготовке Всемирных игр ветеранов спорта, которые должны состояться во французском городе Лионе в 2015 году.

Свой олимпийский титул Кинон завоевал в 1984 году в Лос-Анджелесе. Тогда 22-летний француз стал первым представителем своей страны, сумевшим завоевать олимпийское "золото" в прыжках с шестом. К тому времени ему уже принадлежал мировой рекорд: в 1983 году на соревнованиях в Кельне он взял высоту 5,82 м. Также в активе Кинона было "серебро" ЧЕ-84 в закрытых помещениях.

**Подготовил к печати Антон ВИТАЛЬЕВ.**

ПО ПОВОДУ

## Кому выгодна «коммерческая тайна»?

*Наконец-то после трехмесячных мучительных схваток председатель ФХРБ "родил" нового главного тренера национальной сборной по хоккею.*

Как известно, на прошедшем чемпионате мира по хоккею в Словакии наша национальная сборная заняла 14-е место и ее главный тренер Эдуард Занковец подал в отставку, которая была принята. Но хоккейная жизнь продолжается...

Перед нашей сборной встали две ответственные задачи: успешное участие в домашнем чемпионате мира 2014 года и в олимпийском турнире в Сочи. Понятно, чтобы положительно их решить, нужна серьезная, кропотливая, грамотная подготовка всех кандидатов в сборную, всей команды. Одним словом, нужно провести колоссальную работу и Федерации хоккея, и тренерскому штабу, и самим хоккеистам, тем более что и домашний чемпионат мира, и олимпийский турнир в России проводятся в один год...

Эту работу, как известно, организует и проводит тренерский штаб во главе с главным тренером. Так вот, несмотря на то, что еще 20 мая председатель Федерации хоккея говорил, что нельзя откладывать в долгий ящик этот важный вопрос, назначение произошло только через три месяца. На этот пост назначен финский специалист Кари Хейкккиля. Вновь иностранец.

Конечно, время рассудит, что и как будет, но я откровенно скажу, что не понимаю тех наших спортивных чиновников, которые, как говорят в народе, сало белорусское едят, а считают, что заграничные специалисты лучше наших родных белорусских:.. Или иностранным специалистам можно платить меньше народных денег? Я в этом не уверен, но уверен, что контрактную сумму мы так и не узнаем.

А все потому, что какой-то "умник" придумал, что это коммерческая тайна. Кто мне только вразумительно ответит: а от кого? По логике, сумму озвучить бы стоило хотя бы для того, чтобы налогоплательщики знали, во что стране обходится работа иностранца на посту главного тренера хоккейной команды. Хотя "коммерческая тайна" — это скорее прикрытие, чтобы не дразнить народ... Потому что, если простой заводской рабочий вдруг узнает, сколько месяцев или даже лет ему придется отстоять у станка, чтобы заработать хотя бы месячный оклад "босса" хоккейной дружины, он, мягко говоря, расстроится. А народ в нашем "социально-ориентированном государстве" расстраивать и будоражить нельзя...

Возникает и такой вопрос: почему в очередной раз проигнорировали кандидатуру Михаила Захарова? Кому он так насолил?..

Не будем торопить время, оно все расставит по своим местам.

**С уважением —**

**Юрий ЯСИНСКИЙ, ветеран спорта, заслуженный тренер БССР.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

*Віктар ГАНЧАРЭНКА:*

## «Матчы з "Барселонай" будуць самымі цікавымі ў маёй кар'еры»



Чэмпіён Беларусі па футболе — барысаўскі БАТЭ — прабіўся ў групавы этап Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Сапернікамі беларускай каманды стануць гранды еўрапейскага футбола — іспанская "Барселона", італьянскі "Мілан" і чэшская "Вікторыя".

Галоўны трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка ў інтэрв'ю прэс-службе клуба пракаментаваў вынікі лёсавання.

— Лёсаванне падкінула нямала драматычных момантаў. Так, барысаўчане "выбіралі" з груп з "Барселонай" і англійскім "Манчэстар Юнайтэд", у якасці "першых пасеяных"...

— Ледзь не дацягнулі да англійскага чэмпіёна... Неаднаразова гаварыў, што хацеў бы сустрэцца з "Манчэстар Юнайтэд", паколькі люблю гэтую каманду. Але незадавальнення ад лёсавання, канечне, няма. "Барселона" гуляе ў эталонны футбол, з'яўляецца паўнапраўным уладальнікам кубка чэмпіёнаў. "Мілан" таксама прадстаўляць не трэба. Будзь што будзе. За тыя пару хвілін, што чакалі апошняга саперніка, паспеў "пракруціць" у галаве стадыёны, на якіх прыйдзецца выступаць, моцныя і слабыя бакі ў гульні нашых канкурэнтаў, якую расстаноўку яны выкарыстоўваюць. Пра сябе пачаў думаць, як супрацьстаяць грандам еўрапейскага футбола, колькі ачкоў можна набраць у такой групе...

**— І колькі?**

— Скажу так: на стадыёне "Дынама" мы здольныя аказаць сур'ёзны ціск на любога апанента. У дадатак для каманды важная зараз мэта — мы яшчэ не атрымлівалі перамог у групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў.

**— Чацвёртай у групе H апынулася чэшская "Вікторыя".**

— Па шчырасці, замест яе хацелася б згуляць з дортмундскай "Барусіяй". Там, як і ў Барселоне з Міланам, вялікі стадыён, заўжды запоўнены пад завязку. Гуляць пры аўдыторыі ў 70 тысяч чалавек — гэта вялікі вопыт.

**— Наколькі дадаў гордасці той факт, што ў нашай групе сабраны выключна чэмпіёны сваіх краін?**

— Вельмі прыемна апынуцца ў такой кампаніі, асабліва калі табе належыць сустрэцца з мацнейшымі клубамі Іспаніі і Італіі.

**— На хатніх матчах з "Барселонай" і "Міланам", без сумненняў, будуць аншлагі.**

— Спадзяюся. Нам важна, каб у паядынках з еўрапейскімі топ-клубамі як належыць падтрымлівалі БАТЭ.

**— Матчы з "Барселонай" будуць самымі цікавымі ў вашай трэнерскай кар'еры?**

— Безумоўна. Многія трэнеры спрабуюць "раскусіць" "Барселону", але толькі адзінкі ёй могуць нешта супрацьпаставіць. Хуткасць прыняцця рашэнняў, праца з мячом, выкананне — усё гэта прысутнічае ў дружыны з Каталоніі проста на касмічным узроўні. І для каманды, і для нас, трэнерскага штаба, гэта будзе неацэнны вопыт. Паспрабуем зрабіць тое, што не заўжды ўдаецца "Рэалу", "Манчэстару" і іншым элітным клубам.

ШАХМАТЫ

### Из творчества читателей

*В.Жукович*



**Белые:** Кре2, Лd3, Лg5, Сf6 (4).

**Черные:** Кре4, пп. с5, f5 (3).

**Мат в 2 хода.**

Публикуем двухходовую задачу-миниатюру, которую составил и прислал в редакцию наш постоянный автор, белорусский поэт и перворазрядник по шахматам Василь Жукович. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная Воля", "Шахматы".**

### Сверьте ответы

Решение позиций, опубликованных в газете.

**Композиция В.Чайко: 1.о-о-о!**

**Двухходовка Н.Майстренко и В.Шевцова: 1.Лg6!**

**Задача Г.Летцеля: 1.Kg6!**

**Трехходовка В.Жуковича и В.Жука: 1.Фe5!** 1...b3 2.Фe4 b2 3.Cf2+ Kpc3 4.Ce1x, 1...Kpd3 2.Kpb3 Kpd2 3.Cf2 Kpd1 4.Фe1x.

**Композиция В.Гебельта: 1.Kf5!** Угроза 2.Фf7x. 1...Фa1 2.Kf4x, 1...Лa4 2.K:g7x, 1...Kp:d5 2.Фa2x, 1...Kp:f5 2.Фd7x.

### Успех Сергея Жигалко

Блестяще выступил на традиционном международном шахматном турнире в Баку 22-летний минский гроссмейстер Сергей Жигалко. В сильном по составу турнире он показал очень высокий результат — 7 очков из 9 возможных — и завоевал первый приз. На пол-очка от победителя отстали элитные гроссмейстеры Эмиль Сутовский (Израиль) и россиянин Дмитрий Андрейкин, разделившие 2—3-е места.

### Атакует В.Смыслов

Недавно отмечалось 90-летие со дня рождения выдающегося шахматиста, седьмого в истории шахмат чемпиона мира Василия Васильевича Смыслова (1921—2010). Талант Смыслова проявился очень рано. Уже в 19-летнем возрасте он завоевал бронзовую награду в чемпионате СССР, а через год стал гроссмейстером. В 1957 году Смыслов выиграл матч у чемпиона мира М.Ботвинника и стал обладателем шахматной короны. Приводим блестящую партию юного Смыслова, сыгранную еще в 1940 году, в которой ярко проявился его комбинационный талант.

*Смыслов—Кириллов*

**Испанская партия**

1.e4 e5 2.Kf3 Kc6 3.Cb5 a6 4.Ca4 d6 5.d4 b5 6.Cb3 K:d4 7.K:d4 ed 8.c3 (Не 8.Ф:d4? ввиду 8.c5 9.Фd5 Ce6 10.Фc6+ Cd7 11.Фh5 c4!) 8...dc 9.Фh5 Фe7 (лучше 9...g6) 10.K:c3 Kf6 11.Фe2 Ce6 12.o-o c6 13.Cg5 C:b3 14.ab Фe6 15.Фc2! Грозит 16.K:b5. 15...Kd7 16.Л:a6!! (Эффектный, точно рассчитанный удар. Если 16...Л:a6, то 17.K:b5!) 16...Лc8 17.Лfa1 h6 18.Л:c6!! Л:c6 19.Лa8+ Kb8 20.Л:b8+ Лc8 21.Kd5! Л:b8 22.Фc6+ Фd7 23.Kc7x.

ПРЫЗНАННЕ

*Аляксандр ГУТАР:*

## «Я ўжо гуляў з "Барселонай"... На камп'ютары»



Яшчэ да жараб'ёўкі Лігі чэмпіёнаў галкіпер БАТЭ Аляксандр Гутар падзяліўся ўражаннямі ад выхаду каманды ў гэтую стадыю спаборніцтваў.

— Я вельмі шчаслівы. Заўжды марыў трапіць у групавы турнір Лігі чэмпіёнаў і згуляць там. Так, я ўжо аднойчы, тры гады таму, меў дачыненне да такога ж поспеху БАТЭ, але тады я быў другім галкіперам. У мяне знікае дыханне ад таго, што сапернікам можа стаць нехта з грандаў сусветнага футбола — "Манчэстар Юнайтэд", "Барселона", "Рэал". Я ўжо гуляў з імі, праўда, толькі на камп'ютары. Я вельмі рады. Мы зрабілі вялікую справу. Душа спявае!

### НАШ КАЛЯНДАР

*Стаў вядомы канчатковы расклад гульняў у нашай групе, ён апублікаваны на сайце УЕФА:*

**1-ы тур. 13 верасня:** "Вікторыя Пльзень"—БАТЭ, "Барселона"—"Мілан".

**2-і тур. 28 верасня:** БАТЭ—"Барселона", "Мілан"—"Вікторыя".

**3-і тур. 19 кастрычніка:** "Мілан"—БАТЭ, "Барселона"—"Вікторыя".

**4-ы тур. 1 лістапада:** БАТЭ—"Мілан", "Вікторыя"—"Барселона".

**5-ы тур. 23 лістапада:** БАТЭ—"Вікторыя", "Мілан"—"Барселона".

**6-ы тур. 6 снежня:** "Барселона"—БАТЭ, "Вікторыя"—"Мілан".

**Падрыхтаваў Віталь ГАРБУЗАЎ.**

Услуги

Выкопаю колодец под воду и канализацию. Качественно. Найду воду на участке.

Тел. 8-029-626-32-54.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906
nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

ISSN 2071-9647

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/ 0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 29.08.2011 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 26550 экз. Заказ №4154.